


# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.15 | 20.58 | 15.43 |
| Віцебск — | 4.59 | 20.53 | 15.54 |
| Магілёў — | 5.05 | 20.48 | 15.43 |
| Гомель — | 5.08 | 20.38 | 15.30 |
| Гродна — | 5.32 | 21.12 | 15.40 |
| Брэст — | 5.39 | 21.06 | 15.27 |

## Месяц

*Маладзік 8 мая.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

*Пр.* *Анастасіі, Івана, Мікалая, Паўла, Пятра, Сцяпана, Сямёна, Сяргея.*
*К.* *Антаніны, Антона, Яна.*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# ЗАЎТРА




Надвор'е

# ВЕЦЕР ПАЎНОЧНЫ, УНАЧЫ ЗАМАРАЗКІ

## А ў нядзелю месцамі мокры снег

**Даўно ў нас на старце другой дэкады мая так холадна не было. Як правіла, у гэты час дзяўчаты ўжо ва ўсю загараюць, а моладзь у шортах «рассякае». Селета па-іншаму... Гэтымі днямі ў начны час будзе нават з мінусам, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Праўда, сёння холад злёгку адпусціць. У гэты дзень умовы надвор'я будуць вызначаць атмасферныя франты, якія ссоўваюцца з паўночнага захаду Еўропы, і будзе паступленне больш цёплай паветранай масы. Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Ноччу месцамі, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. Вецер заходні, паўночна-заходні ўмераны, удзень парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 2 цяпла да плюс 8 градусаў, удзень — 10—16 цяпла, на поўдні краіны да плюс 20 градусаў. Атмасферны ціск ноччу і раніцай будзе падаць, днём істотна не зменіцца.

А вось у суботу ноччу захаваецца ўплыў атмасферных франтоў, якія ссоўваюцца на Бранскую вобласць, аднак днём умовы надвор'я будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, якая сфарміравана ў халодных паветраных масах паўночных шырот. Чакаецца пераменная воблачнасць. Ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём пераважна без ападкаў. Вецер паўночна-заходні, паўночны парывісты, удзень на паўночным усходзе месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы стане паніжацца, але будзе кантраснай (ад плюс 1 градуса на паўночным захадзе да 9 цяпла на паўднёвым усходзе краіны). Днём паветра прагрэецца да 10—17 цяпла.

Зусім не майскае надвор'е чакаецца ў нядзелю. У гэтыя суткі метэаўмовы будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі днём ва ўсходніх раёнах адаб'ецца ўплыў маларактыўнага франтальнага раздзелу. Чакаецца пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, толькі днём ва ўсходніх раёнах краіны месцамі магчымыя невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Вецер паўночны, паўночна-заходні ўмераны, у дзённыя гадзіны па ўсходзе краіны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу 1—5 цяпла, але месцамі па краіне чакаюцца замаразкі да мінус 3 градусаў. Удзень вясновае сонца будзе разаграваць паветра, калі чакаецца тэмпература ад 10 градусаў на ўсходзе, да плюс 18 градусаў на захадзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**❍ Тым часам**

Паніжаны тэмпературны рэжым стрымлівае развіццё большасці сельскагаспадарчых культур. Па апошніх даных на пасевах яравых збожжавых культур назіраецца трэці ліст. Пераважна на захадзе і ў паўднёвай частцы краіны пачалося кушчэнне, месцамі ў аўса і ячменю ідзе закладка коласа. На пазнейшых пасевах назіраюцца ўсходы. У Віцебскай і Гомельскай вобласці на ўчастках, засеяных у канцы красавіка — пачатку мая, ідзе прарастанне збожжа, — адзначылі ў Белгідрамеце.

Паводле інфармацыі спецыялістаў, аграметэаралагічныя ўмовы на тэрыторыі краіны пагоршыліся. Перавага паніжанага тэмпературнага рэжыму ў найбліжэйшы час будзе стрымліваць рост і развіццё большасці сельскагаспадарчых культур, асабліва цеплалюбівых. З-за пагрозы начных замаразкаў у асобных раёнах не выключана верагоднасць пашкоджанняў кветак і завязі пладовых дрэў, а таксама ўсходаў кукурузы.

## УСМІХНЕМСЯ

**— Дарагая, размова з табой, як размініраванне боепрыпасаў часоў вайны — не ведаеш, у які момант іркане і па якой прычыне.**

**— Значыць, па-твойму, я старая?!**

Муж будзіць жонку:

— Дарагая, уставай, праз 15 хвілін на работу выходзіць!

— Ды як так! Нельга было раней разбудзіць? Мне яшчэ 20 хвілін фарбавацца!

— Не крычы, пакуль ты спала, я цябе нафарбаваў!

**— А я эканом-класам ніколі не лётаю.**

**— Малайчына, лётаеш першым або бізнес-класам?**

**— Не, у плацкартным.**



## 10 МАЯ Даты Падзеі Людзі

**У краіне**

**1706** год — Вялікая Паўночная вайна: шведскае войска на чале з Карлам XII увайшло ў Нясвіж.



**1883** год — нарадзіўся Янка Маўр, беларускі пісьменнік, аўтар апавяданняў, аповесцяў і раманаў для дзяцей і моладзі: «Сын вады», «У краіне райскай птушкі», «Палескія рабінзоны», «Слёзы Тубі» і многіх іншых.

**1892** год — пачала дзейнічаць Мінская конка — грамадскі транспарт Мінска, які працаваў у 1892—1928 гадах. Налічвала тры маршруты: паміж Брэсцкім і Віленскім вакзаламі; ад Віленскага вакзала да Саборнай плошчы, які ішоў па Пецярбургскай, Каломенскай, Захар'еўскай і Губернатарскай вуліцах; ад Раманаўскай Слабады да Залатой Горкі. Пазней з'явілася адгалінаванне да бровара Фрумкінай. У выніку Мінская конка звязвала цэнтр горада з вакзаламі і прадмесцямі. Вагон з 20 сядзеннямі цягнулі 2-3 кані.

**1931** год — нарадзіўся Сцяпан Гаўрусёў, беларускі паэт і перакладчык. Скразны матыў, які прагучаў у паэзіі Сцяпана Гаўрусёва, — памяць аб вайне, трывога за мір у свеце, адказнасць за ўсё жывое на зямлі.

**У свеце**

**1497** год — пачалося другое падарожжа Амерыга Веспучы ў Новы Свет.

**1932** год — у Ленінградзе завод «Камінтэрн» выпусціў першыя 20 савецкіх тэлевізараў.

**1940** год — кароль Георг VI афіцыйна, у сувязі з надзвычайнымі абставінамі, прызначыў Уінстана Чэрчыля прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі.

**1941** год — Рудольф Гес здзейсніў пералёт у Шатландыю для арганізацыі, як мяркуецца, мірных перагавораў паміж Вялікабрытаніяй і Германіяй. Дарэчы, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Уінстан Чэрчыль, даведаўшыся аб прыбыцці ў краіну Рудольфа Геса, увечары 11 мая за праглядам кінакамедыі, спачатку палічыў гэтую інфармацыю фантастычнай і вырашыў спакойна дагледзець фільм да канца. Гес меў падрабязныя звесткі аб падрыхтоўцы нападу Германіі на СССР, і, дзякуючы звесткам, атрыманым ад яго, праз некалькі дзён міністр замежных спраў Энтані Ідэн паслаў афіцыйнае папярэджанне Сталіну, што ў сярэдзіне чэрвеня адбудзецца напад Германіі на СССР.

Так гаварыў...

**ФЁДАР ДАСТАЕЎСКІ:**

*«Ёсць тры рэчы, якіх баіцца большасць людзей: давяраць, гаварыць праўду і быць сабой».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.816. Індэкс 63850. Зак. № 1080.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 мая 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12